# АФГАНЕЦ І «ЛІНІЯ СТАЛІНА»

*Гартаю старонкі кнігі «“Лінія Сталіна”: Праўда і памяць гісторыі», якую падаравала Вера Ігнатаўна Мятла. Яе сын Аляксандр – аўтар выдання.*

*Не аднойчы ў тэлеперадачах чуў пра Аляксандра Міхайлавіча Мятлу, але толькі ў апошняй высветліў, што ён наш зямляк. Нарадзіўся ў вёсцы Касатыя Завуццеўскага сельсавета. Размешчана яна непадалёку ад шашы Дзісна-Полацк. Нічым не прыкметная, якіх дзесяткі ў раёне. Побач вёсачкі Мысліўцы, Гаеўка, Мётлы, далей аграгарадок Цвеціна.*

Дакументальную аповесць пра Аляксандра Міхайлавіча напісаў Барыс Налівайка. Чым жа праславіўся наш зямляк? Размаўляючы з Верай Ігнатаўнай, прыйшоў да высновы: рэальнасць – дзея не лакіраваная. Яе твар не падобны на бадзёрыя рэпартажы, на рэкламныя ролікі і шчыты. Аблічча нашага жыцця пераразаюць маршчыны няпростых клопатаў, побач з маленькімі радасцямі вырастаюць драмы і нават трагедыі. Драматызмам напоўнена жыццё Аляксандра Міхайлавіча Мятлы. Прозвішча з адценнем добрага гумару. Адкуль яно – невядома. Продкі Аляксандра жылі ў вёсцы Мётлы. Большасць жыхароў насілі такое ж прозвішча – Мятла. Гэта род людзей жыццястойкіх і моцных. У мірны час займаліся звыклай сялянскай справай – аралі, сеялі, гадавалі жывёлу. А калі насоўвалася пагроза вайны браліся за зброю, мужна абаранялі Радзіму.

Так было і ў гады Вялікай Айчыннай. Многія родзічы Аляксандра Міхайлавіча пайшлі ў армію, змагаліся з захопнікамі ў партызанскіх атрадах. Нават яго дзядуля Ігнат Рыгоравіч не застаўся ў баку ад барацьбы з ворагам – дапамагаў партызанам усім, чым мог: забяспечваў харчаваннем, выменьваў у нямецкіх абознікаў на курэй і яйкі вельмі патрэбныя ў лесе медыкаменты.

Карнікі даведаліся, што вяскоўцы дапамагаюць лясным салдатам, схапілі 12 чалавек. Іх жорстка катавалі, а затым расстралялі.

У першы клас Саша пайшоў у Кадушчанскую школу. Пасля яе вучыўся ў Мятлянскай васьмігодцы. Адтуль паступіў у Магілёўскае культасветвучылішча. Працаваў загадчыкам Цвецінскага клуба.

У 1971-ым пайшоў у армію. Яго накіравалі ў паветрана-дэсантныя войскі. Служыў у Баравусе-1. Не раз сяржант Аляксандр Мятла, інструктар па выкіду цяжкай баявой тэхнікі дэсантнікаў, пралятаў над роднай вёсачкай. Вачыма адшукваў свій дом, аглядаў берагі Заходняй Дзвіны, успамінаў экскурсіі і рыбалку.

Пра тое, каб стаць прафесійным ваенным, тады яшчэ не думаў. Але строгі армейскі парадак, арганізаванасць падабаліся маладому байцу. Вось і вырашыў стаць афіцэрам.

Бацькі не пярэчылі, хаця маці ціхенька змахвала слязінкі з вачэй. Неўзабаве Аляксандр паступіў у Львоўскае вышэйшае ваенна-палітычнае вучылішча. Закончыў вучобу паспяхова, стаў першым афіцэрам у родзе Мётлаў.

Паслужыць давялося ў розных кутках Саюза – у Закаўказскай веннай акрузе, у групе савецкіх войск у Германіі. Удзельнічаў у вучэннях, разам з салдатамі асвойваў новую ваенную тэхніку і ўзбраенне, уважліва ставіўся да вайскоўцаў. Палітработніка паважалі. Афіцэр уносіў рацыяналізатарскія прапановы, якія ўкараняліся ў практыку ваеннага навучання. Напрыклад, прапанаваў зрабіць канструкцыю на колах з устаноўленым на ёй мінамётам. Гэта дазваляла хутка мяняць пазіцыі і адкрываць агонь, не трацячы асаблівых намаганняў.

З Германіі маёр Мятла разам з сям’ёй вярнуўся ў Беларусь. Сямейным чалавекам ён стаў яшчэ ў курсанцкія гады. Сустрэў прыгожую дзяўчыну Ліду, згулялі сціплае вяселле. У іх нарадзіліся два сыны – Саша і Міша. Змалку хлапчукі хацелі стаць ваеннымі. У юначыя гады мара ажыццявілася: Аляксандр закончыў Ваенную акадэмію Рэспублікі Беларусь з залатым медалём, служыў у ваенна-паветраных сілах. У Міхаіла дыплом Акадэміі МУС.

Перыяд стабільнага жыцця закончыўся нечакана. Было загадана з’явіцца ў штаб. А там сказалі: «Збірайся, маёр, у Афганістан».

Пра падзеі ў гэтай краіне Аляксандр Міхайлавіч ведаў з размоў з непасрэднымі ўдзельнікамі баявых дзеянняў. Ведаў палітработнік, якія страты неслі нашы войскі.

Ваеннаму чалавеку збірацца доўга не даводзіцца – такая ўжо доля афіцэра: служы Айчыне там, дзе загадаюць.

Раніцай Аляксандр Міхайлавіч развітаўся з роднымі. Жонка трымалася спакойна, хаця душэўная трывога не пакідала. На вайне ўсялякае можа здарыцца. Недаваў волі сваім пачуццям і Аляксандр Міхайлавіч. За гады сумеснага жыцця пераканаўся, што спадарожніцу выбраў надзейную, яна заўсёды падтрымлівала ў нялёгкіх сітуацыях.

Калі Аляксандр Міхайлавіч прыляцеў у Кабул, там стаяла спёка. Трэба было прывыкаць да ўсяго: да клімату, да нечаканых абстрэлаў. З афганскай сталіцы меркаваўся пералёт у Гардэз на верталёце МІ-8 у начны час. Так было бяспечней: на большай вышыні «духі» не маглі дастаць «Стынгерамі» вінтакрылыя машыны. Аднак да месца прызначэння дабраўся на бронетранспарцёры ў калоне, якую не раз абстралялі.

Палітработнік адразу прыступіў да выканання сваіх абавязкаў, пазнаёміўся з камандзірамі рот, батальёнаў, пабываў на заставах, гутарыў з дэсантнікамі. Сам суправаджаў калоны. Рэдка такія пераходы заканчваліся без страт. Душманы рабілі засады ў самых нэчаканых месцах, імкліва нападалі, агонь адкрывалі з укрыццяў. Аляксандр

Міхайлавіч аналізваў сітуацыю, заўважыў, што праціўнік для засад аблюбаваў адно месца, якое, напэўна, для яго было зручным. З вышыні вёў агонь, а калі адыходзіў, то выкарыстоўваў звілістыя горныя сцежкі, перасохлыя рэчышчы рачулак. Пакідаў месца бою паспешліва і амаль беспакарана: насцільны аўтаматна-кулямётны агонь не вельмі эфектыуны. Чэргі не даставалі «духаў». Выказаў прапанову, каб стральба была навяснoй. А для гэтага ўстанавілі мінамёты ў кузавах «Уралаў». Дэсантнікі неўзабаве праверылі эфектыўнасць перасоўнай батарэі. Калі маджахеды адкрылі агонь са сваёй любімай пазіцыі, дэсантнікі адказалі са сваёй устаноўкі. Міны дакладна накрылі ворага. З таго дня над тым небяспечным участку дарогі праціўнік не з’яўляўся. Гэта сведчыла, што ён панёс значныя страты.

Пра мадэрнізаваную мінамётную ўстаноўку даклалі камандаючаму 40-й арміі генералу Барысу Громаву. Камандарм сам з цікавасцю агледзеў яе, ацаніў як каштоўную рацыяналізацыю. А на пагонах Аляксандра з’явіліся новыя зоркі. Званне падпалкоўніка яму прысвоілі датэрмінова. Пазней да баявых медалёў дабавіўся ордэн Чырвонай Зоркі. Мінамётную ўстаноўку назвалі яго прозвішчам, яны з’явіліся ў іншых падраздзяленнях.

Ваеннае жыццё працягвалася. Палітработнік заўсёды быў з салдатамі. Частыя сутычкі з праціўнікам. Не раз трапляў у складаныя сітуацыі, атрымліваў кантузіі. Звычайна пасля гэтага даводзілася паляжаць дні 3-4 у медпункце. Заўсёды, выконваючы баявое заданне, падпалкоўнік не грэбаваў бронекамізэлькай і каскай. Трэба сказаць, што гэтыя ахоўныя сродкі не раз лавілі кулі праціўніка, смерць абыходзіла яго.

Пасля вяртання з Афганістана Аляксандра Міхайлавіча накіравалі ў Брэсцкі гарнізон у дэсантна-штурмавую брыгаду. Траўмы і кантузіі, на жаль, давалі пра сябе адчуць. Урачы вынеслі вердыкт; годны да нестраявой службы ў мірны час. Аляксандру тады не было і 40. Аднак прывыклы да жывых зносін з людзьмі і актыўнай дзейнасці Аляксандр Міхайлавіч доўга заставацца без справы не мог. У пачатку 90-х у Беларусі пачалі ствараецца грамадскія арганізацыі воінаў-інтэрнацыяналістаў. Слоў было шмат, а практычных спраў бракавала. Нейкі час былы палітработнік працаваў на пасадзе дырэктара аднаго з брэсцкіх дарожна-будаўнічых прадпрыемстваў. А потым па прычыне нездароўя пераехаў у Мінск. Там ён сустрэўся з падпалкоўнікам запасу Генадзіем Тумілевічам. Абмяркоўвалі розныя пытанні. Афганцам часам няпроста было ўладкавацца на працу, вырашыць жыллёвую праблему. У Беларусі ў той час налічвалася больш 30 тысяч удзельнікаў афганскай вайны. У ваенных узнікла ідэя стварыць арганізацыю, якая б дапамагала былым афганцам знайсці сябе ў новых рэаліях.

Восенню 2001 года афіцэры-афганцы на ўстаноўчым сходзе ўтварылі «Дабрачынны фонд дапамогі воінам-інтэрнацыяналістам “Памяць Афгана”», зарэгістравалі сваю арганізацыю ў Мінскім гарвыканкаме. Прэзідэнтам фонду быў абраны Аляксандр Мятла.

З таго моманту пачаўся адлік дзейнасці фонду і яго прэзідэнта. Ужо праз год для інвалідаў-афганцаў фонд набыў некалькі легкавых аўтамабіляў «Ака». Уручыў іх на востраве Мужнасці і Смутку ў Мінску ўдзельнік баявых дзеянняў у Афганістане Віктар Шэйман, які ў той час з’яўляўся Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь.

Дабрачынны фонд разгарнуў актыўную дзейнасць. Асаблівая ўвага тым, хто страціў у баях здароўе, застаўся без рукі ці нагі, пазбавіўся зроку ці слыху, пакутуе ад стрэсаў. Фонд абапіраецца перш усяго на людзей спагадлівых і сумленных.

... У кнізе «“Лінія Сталіна”: Праўда і памяць гісторыі» Аляксандр Міхайлавіч сабраў багаты ваенна-гістарычны матэрыял пра ўмацаваныя раёны, якія былі створаны напярэдадні вайны. Абставіны нашага часу прымушаюць усіх, хто нераўнадушны да мінулага, многае пераасэнсаваць, сказаць іншымі словамі пра подзвіг народа. Так нарадзілася ідэя стварэння ваенна-гістарычнага музея «Лінія Сталіна». Намаганнямі тысяч людзей аб’ект быў адкрыты 30 чэрвеня 2005 года. Прысутнічаў прэзідэнт краіны А. Р. Лукашэнка, які падкрэсліў: новы ваенна-гістарычны музей павінен стаць цэнтрам ваенна-патрыятычнага выхавання моладзі.

Аляксандр Міхайлазіч у сваёй кнізе піша, што сёння перад усімі намі стаіць новая задача: як захаваць памяць пра подзвіг слаўных абаронцаў нашай Айчыны для новых пакаленняў. Цяпер трэба па-іншаму адказваць на пытанні, адказы на якія былі зразумелы людзям старэйшага пакалення: «Як і дзеля чаго мы ваявалі?», «Як і чаму мы перамаглі?», «Якая была цана перамогі?»; «Як адносіцца да сваёй гісторыі». Кожное новае пакаленне па-свойму перачытвае старонкі гісторыі і асэнсоўвае яе ўрокі.

Пра Вялікую Айчынную выходзяць тысячы кніг. Аднак да гісторыі можна падысці па-рознаму. Можна прачытаць кнігу пра вайну, а можна паглыбіцца ў жывую гісторыю, прыйсці на тое месца, дзе здзяйсняліся гістарычныя падзеі.

Пра гэту жывую памяць думалі воіны-інтэрнацыяналісты, калі вырашылі стварыць ваенна-гістарычны музей пад адкрытым небам. Ініцыятарам адраджэння гістарычнай памяці стаў «Дабрачынны фонд дапамогі воінам-інтэрнацыяналістам “Памяць Афгана”», дэвіз якога: «Калі не мы, то хто...»

... Вяртаюся да размовы з Верай Ігнатаўнай Мятла. Жанчына расказала некаторыя падрабязнасці са школьнага жыцця яе сына. Гаварыла, што не раз прапаноўваў ей пераехаць у сталіцу. Не хоча, бо родная зямелька, вёсачка не адпускаюць. Яна рада ў сваім доме прыняць дарагіх яе сэрцу людзей – сынкоў з іх сем’ямі. Заўважыла, што мае ўжо

пяцёра ўнукаў і столькі ж праўнукаў. І яшчэ: жыццё – гэта пастаянная творчасць. Каб пакінуць пасля сябе добрую памяць, чалавеку не абавязкова быць надзеленым выключным талентам, станавіцца артыстам, вучоным, дзяржаўным дзеячам. Звычайныя людзі розных прафесій маюць для гэтага не меншыя магчымасці. Кожны з нас здольны і павінен ствараць вакол сябе ратавальную аўру праўды і дабра, падтрымліваць аптымізм жыцця. Усё гэта ярка дэманструе наш зямляк Аляксандр Міхайлавіч Мятла.

***Л. Касаты***

*Міёрскія навіны. — 2008. — 10 мая. — С. 3.*